# Рэалізацыя прынцыпу апоры на марфемную структуру слова пры навучанні арфаграфіі

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
аспірантка кафедры беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка.

Чытачам прапануецца другі артыкул з серыі публікацый, прысвечаных практычнай рэалізацыі лінгваметадычных прынцыпаў навучання арфаграфіі ў школах з рускай мовай выкладання. Н. М. Антановіч на аснове праведзенага даследавання прапануе шляхі ўдасканалення навучання арфаграфіі ў пачатковай школе. Пазіцыя аўтара тэарэтычна абгрунтаваная і ілюструецца практычным матэрыялам, што адпавядае крытэрыям навуковай навізны і практычнай значнасці публікацый.

*Навуковы рэдактар*



У артыкуле разглядаюцца асаблівасці рэалізацыі прынцыпу апоры на марфемную структуру слова пры навучанні беларускай арфаграфіі вучняў пачатковых класаў ва ўмовах руска-беларускага білінгвізму. У якасці асноўных метадаў, якія рэалізуюць названы прынцып, вылучаны алгарытмізацыя і марфеміка-арфаграфічныя практыкаванні, правядзенню якіх у шматлікіх выпадках папярэднічаюць фанетыка-арфаграфічныя практыкаванні.

Вывучэнне марфемнай структуры слова з'яўляецца важнай умовай павышэння арфаграфічнай пісьменнасці вучняў пачатковых класаў, таму што арыенціроўка на марфему ў шматлікіх выпадках дапамагае дакладна вызначыць арфаграму. Прыватнаметадычны **прынцып апоры на марфемную структуру слова** выкарыстоўваецца пры вывучэнні напісанняў, заснаваных як на фанетычным (правапіс апострафа паміж прыстаўкай і коранем; правапіс прыставак, якія заканчваюцца на ***з- (с-)***), так і марфалагічным (правапіс слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці; правапіс прыставак ***аб-***, ***ад-***, ***над-***, ***пад-***) прынцыпах беларускага правапісу, а таксама пры вывучэнні правапісу склонавых канчаткаў назоўнікаў і прыметнікаў, асабовых канчаткаў дзеясловаў, якія грунтуюцца на розных прынцыпах.

Вызначым найбольш рацыянальныя і эфектыўныя метады і прыёмы рэалізацыі прынцыпу апоры на марфемную структуру слова.

Арфаграфічныя памылкі малодшых школьнікаў часам тлумачацца тым, што вучні не могуць абгрунтаваць напісанне. У працэсе вывучэння арфаграфічнага матэрыялу настаўнікі традыцыйна абмяжоўваюцца рэкамендацыяй выкарыстоўваць правіла для тлумачэння і звяртацца да яго ў час пісьма. Аднак гэта не дае патрэбнага выніку. Каб прывесці ў дзеянне арфаграфічнае правіла, трэба ведаць не толькі правіла, але і спосаб яго прымянення, умець карыстацца ім у канкрэтных сітуацыях.

На фарміраванне арфаграфічных навыкаў уплываюць разнастайныя фактары. А. І. Уласенкаў слушна заўважае, што значную ролю ў іх фарміраванні адыгрывае "арганізацыя разумовай дзейнасці вучняў", якая з'яўляецца перадумовай, элементам фарміравання свядомага навыку [4, с. 4]. Вучням патрэбна засвоіць сістэму прадпісанняў (алгарытмаў) па выкарыстанні правіл.

Як сведчаць вынікі даследаванняў псіхолагаў, фарміраванне навыкаў на першапачатковым этапе суправаджаецца інтэнсіўнай разумовай дзейнасцю. У гэты перыяд магчыма кіраванне разумовымі аперацыямі, якія ў значнай меры забяспечаць выпрацоўку навыку.

Арфаграфічныя правілы з'яўляюцца асновай для распрацоўкі алгарытмаў, прымянення пэўнай паслядоўнасці схем лагічнага, фанетычнага і граматычнага аналізу. Перш чым вызначыць паслядоўнасць разумовых дзеянняў, неабходна прааналізаваць правіла, для рэалізацыі якога ствараецца алгарытм, "выдзе-

ліць усе прыметы арфаграфічнага правіла, размясціць іх у лагічнай паслядоўнасці, з улікам іх узаемасувязі, і надаць гэтым прыметам форму прадпісання для выканання дзеяння" [4, с. 10].

У лінгваметадычнай навуцы ёсць непасрэдныя ўказанні на прыёмы работы, блізкія да алгарытмічных прадпісанняў (Л. П. Федарэнка, Н. М. Алгазіна, М. М. Разумоўская і інш.). Ёсць даследаванні, прысвечаныя апісанню алгарытмічнай структуры арфаграфічнага дзеяння. А. І. Уласенкаў, М. Р. Львоў прапанавалі некаторыя ўзоры алгарытмаў па правапісе (у дачыненні да рускай арфаграфіі). Л. Н. Ланда, А. І. Уласенкаў сфармулявалі прынцыпы складання і выкарыстання алгарытмаў.

Разгледзім магчымасці выкарыстання метаду ***алгарытмізацыі*** пры навучанні беларускай арфаграфіі вучняў пачатковых класаў ва ўмовах руска-беларускага білінгвізму.

У працэсе даследавання працэсу фарміравання арфаграфічнага навыку ў сітуацыі руска-беларускага двухмоўя мы прыйшлі да высновы, што алгарытмізацыя, як і ў выпадку з прынцыпам апоры на нормы літаратурнага вымаўлення, таксама з'яўляецца адным з метадаў рэалізацыі прынцыпу апоры на марфемную структуру слова. Як правіла, алгарытмы, што рэалізуюць прынцып апоры на марфемную структуру слова, уяўляюць сабой больш **пашыраныя мадэлі**. У працэсе карыстання імі патрабуецца выкананне большай колькасці аперацый у параўнанні з алгарытмамі, якія рэалізуюць прынцып апоры на нормы літаратурнага вымаўлення.

Лінгвістычнай асновай распрацоўкі алгарытмаў з'яўляецца структура канкрэтнай арфаграмы. У алгарытмы, якія рэалізуюць прынцып апоры на марфемную структуру слова, як правіла, уключаюцца аперацыі, што прадугледжваюць і фанетычны, і марфемны аналіз слова. Спынімся на прыкладах *(гл. алгарытмы 1, 2)*.

Схема алгарытму правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці, можа складацца з адной аперацыі (змяні слова або падбяры аднакаранёвае слова, каб пасля парнага зычнага стаяў галосны), якая лёгка запамінаецца ў вуснай форме, але да яе выкарыстання неабходна перайсці пазней.

На пачатковым этапе фарміравання арфаграфічнага навыку ўсё ж такі варта прытрымлівацца кожнага кроку алгарытму, гэта "забяспечвае свядомае засваенне навыку" [3, с. 144]. Толькі ў тым выпадку, калі навык даведзены да аўтаматызму, у рабоце па алгарытме адбываецца "скарачэнне" аперацый.

Падкрэслім, што пры рабоце па алгарытмах у працэсе вывучэння беларускай арфаграфіі неабходна ўлічваць асаблівасці рускай арфаграфіі. Так, нека-

*1. Алгарытм правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці (для III класа).*




*2. Алгарытм правапісу прыставак на **з-** (**с-**)*



торыя вучні пад уплывам рускай арфаграфіі незалежна ад фанетычных асаблівасцей слова пішуць прыстаўку ***с-*** (у выніку няправільных абагульненняў лічаць, што ў беларускай мове прыстаўкі ***з-*** няма) [1].

У сувязі з гэтым у працэсе выкарыстання метаду алгарытмізацыі важна, каб дзейнасць па алгарытме не была фармалізаванай. Кожны этап алгарытму павінен быць усвядомлены і адпрацаваны вучнямі. Неабходна адзначыць, што ў адносінах да правапісу галосных і зычных у прыстаўцы, корані і канчатку паслядоўнасць разважанняў будзе своеасаблівая. Таму для кожнай арфаграмы патрабуецца распрацоўка свайго алгарытму.

Важным метадам рэалізацыі прынцыпу апоры на марфемную структуру слова з'яўляюцца **марфеміка-арфаграфічныя практыкаванні**. Аднак, як правіла, іх правядзенню павінны папярэднічаць **фанетыка-арфаграфічныя практыкаванні**. Па сутнасці, у працэсе выканання названых практыкаванняў вучні авалодваюць асобнымі аперацыямі, якія ўключаны ў схему алгарытму.

Разгледзім асаблівасці выкарыстання ўзгаданых вышэй арфаграфічных практыкаванняў на прыкладзе вывучэння тэмы "Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме".

Вучні пачатковых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання дапускаюць вялікую колькасць памылак у правапісе слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці, нягледзячы на тое, што з аналагічным правілам яны ўжо знаёмы з урокаў рускай мовы. Названыя памылкі тлумачацца наступнымі прычынамі. З аднаго боку, вучні не дыферэнцуюць звонкія і глухія зычныя, не адчуваюць розніцы ў іх утварэнні, а з другога — не ведаюць фанетычных законаў, звязаных з азванчэннем і аглушэннем зычных у пэўных пазіцыях [1]. Неабходна, каб вучні асэнсавана размяжоўвалі звонкія і глухія зычныя гукі па спосабе іх утварэння, а не шляхам механічнага завучвання.

Прасочым паслядоўнасць вывучэння названай тэмы. Згодна з вучэбнай праграмай па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання тэма "Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме" вывучаецца ў II класе [7]. У падручніку па беларускай мове для II класа прадстаўлены разнастайныя практыкаванні на знаёмства з зычнымі, якія ўтвараюць пары па звонкасці-глухасці, аднак толькі ў адным практыкаванні, якое папярэднічае правілу, звяртаецца ўвага на вымаўленне слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад глухімі зычнымі [6]. На наш погляд, у гэтым накірунку неабходна праводзіць больш дасканалую падрыхтоўку, якая прадугледжвае гука-літарны аналіз слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці. Пры гэтым варта выкарыстоўваць наступныя прыёмы: выразнае вымаўленне слова, параўнанне слоў па гучанні і напісанні (параўнанне гукавога і графічнага комплексаў).

Можна прапанаваць наступныя *падрыхтоўчыя практыкаванні* для назіранняў за вымаўленнем слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі на канцы слоў і ў сярэдзіне слова перад зычнымі.

- Прачытайце словы. Параўнайце вымаўленне апошняга гука ў словах кожнага слупка. Ці супадае іх вымаўленне? Назавіце літару, якой абазначаны апошні гук у словах. Чаму ў словах запісаны розныя літары?

[пахо**т**] пахо**д** [ву**ш**] ву**ж** [ду**п**] ду**б**
[ко**т**] ко**т** [ко**ш**] ко**ш** [су**п**] су**п**

[гарбу**с**] гарбу**з** [твaро**х**] тваро**г**
[ву**с**] ву**с** [гаро**х**] гаро**х**

- Вымавіце словы. Назавіце гукі, якія абазначаюцца выдзеленымі літарамі.

ко**ш**ка вё**с**ка кве**т**ка ла**п**ка ба**ц**ька
но**ж**ка ка**з**ка ло**д**ка ба**б**ка дзя**дз**ька

У якіх словах вымаўленне і напісанне не супадаюць? Як вызначыць правільнае напісанне слоў?

- Прачытайце словы. Назавіце гукі, якія абазначаюцца выдзеленымі літарамі. Ці супадае вымаўленне і напісанне слоў?

Маро**з** — мара**з**ы, кола**с** — кала**с**ы.
Са**д** — са**д**ы, бра**т** — бра**т**ы.
Бяро**з**ка — бяро**з**а, лі**с**ка — лі**с**а.
Лы**ж**ка — лы**ж**ачка, мы**ш**ка — мы**ш**ы.

Што трэба зрабіць са словам, каб вызначыць напісанне парных звонкіх і глухіх зычных?

У працэсе выканання практыкаванняў прыведзенага вышэй тыпу ўстанаўліваецца неадпаведнасць паміж вымаўленнем і напісаннем у некаторых словах. У выніку фарміруецца ўменне вызначаць арфаграму. Акрамя таго, выпрацоўваюцца навыкі літаратурнага вымаўлення.

Такім чынам, падрыхтоўчыя практыкаванні з'яўляюцца абавязковым элементам у сістэме арфаграфічных практыкаванняў. (Пра элементы сістэмы моўных практыкаванняў па засваенні пэўнага матэрыялу гл. у артыкуле "Рэалізацыя прынцыпу апоры на нормы літаратурнага вымаўлення пры навучанні малодшых школьнікаў арфаграфіі".) Але ў залежнасці ад арфаграмы іх змест будзе розным.

Фарміраванне навыку правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці, у II класе адбываецца ў працэсе выканання **фанетыка-арфаграфічных практыкаванняў**. Пры іх выкананні выкарыстоўваюцца такія прыёмы, як гука-літарны аналіз слова, выбар праверачнага слова з прапанаваных слоў, супастаўленне правяраемага слова з праверачным, самастойны падбор праверачнага слова. Сістэма практыкаванняў па фарміраванні навыку правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкаці-глухасці, на канцы слоў, раздічаная на пяць узроўняў засваення вучэбнага матэрыялу для II класа, можа быць наступнай.

1. Прачытайце. Назавіце апошні гук у выдзеленых словах. Якія словы з'яўляюцца праверачнымі да выдзеленых слоў?

**зуб** зубкі зубы
**колас** каласы каласкі
**слуп** слупы слупкі
**груз** пагрузка грузы

Запішыце выдзеленыя словы разам з праверачнымі.

2. Прачытайце пары слоў.

самалёты — самалё..
нажы — но..
лясы — ле..
пірагі — піро..

Якія гукі вымаўляюцца на месцы пропускаў? Якія літары трэба ўставіць? Растлумачце. Спішыце пары слоў, устаўляючы прапушчаныя літары.

3. Прачытайце скорагаворку. Якія гукі вымаўляюцца на канцы выдзеленых слоў?

Падрыў **кро..** крывы **пло..**, рые норку ў **агаро..** .
*(Васіль Вітка.)*

Якія літары трэба ўставіць? Растлумачце. Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары.

4. Паслухайце прыказку. Чаму так гавораць?

Беражы нос у вялікі мароз.

Запішыце прыказку па памяці. Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба правяраць. Назавіце праверачныя словы.

5. Дапішыце ў кожным слупку адну і тую ж літару, каб атрымаліся розныя словы. Назавіце праверачныя словы.

| | |
|---|---|
| са□ | ко□ |
| мё□ | кі□ |
| ло□ка | ні□ка |
| бу□ка | цё□ка |

Пры распрацоўцы сістэмы практыкаванняў неабходна ўлічваць, што на кожны з пяці ўзроўняў засваення арфаграфічнага матэрыялу можа быць прапанавана не адно, а пэўная (неабходная) колькасць практыкаванняў.

У III класе прадугледжана паўтарэнне тэмы "Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме". На паўтарэнне названай тэмы ў падручніку прадстаўлена не сістэма, а сукупнасць практыкаванняў без уліку ўзроўняў засваення вучэбнага матэрыялу. Практыкаванні творчага (пятага) узроўню не прадугледжаны. Акрамя таго, у падручніку змешчана толькі частка правіла правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці: "На канцы слова і перад глухім зычным звонкі гук замяняецца на глухі гук: пла[д]ы — пло[т], ка[з]ачны — ка[с]ка. Як правільна абазначыць на пісьме парны зычны? Трэба змяніць слова ці падабраць праверачнае так, каб гэты гук знаходзіўся перад галосным" [2, с. 12]. Пра перадачу на пісьме глухіх зычных перад звонкімі зычнымі не ўзгадваецца. На асобных прыкладах *(касьба [каз'ба], малацьба [маладз'ба])* можна паказаць, што глухія зычныя перад звонкімі вымаўляюцца звонка і для вызначэння іх правільнага напісання прымяняецца той жа спосаб праверкі: *ка<u>с</u>іць — ка<u>с</u>ьба, мала<u>ц</u>іць — мала<u>ц</u>ьба*. Гэта дазволіць сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб правапісе слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці.

На наш погляд, вывучэнне правапісу слоў з парнымі па звонкасці-глухасці зычнымі ў III класе неабходна разглядаць на якасна новым узроўні (наступным этапе фарміравання арфаграфічнага навыку) — на марфемнай аснове пасля знаёмства з роднаснымі (аднакаранёвымі) словамі. Пры гэтым больш увагі надаецца такому прыёму праверкі, як падбор аднакаранёвага слова, у якім пасля парнага зычнага знаходзіцца галосны. Адбываецца перанос аднастайнасці напісанняў на іншыя аднакаранёвыя словы. У тым выпадку, калі навык правапісу слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі не сфарміраваны ў II класе, карысна выкарыстоўваць прыведзены вышэй алгарытм правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці.

Праверка правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці, не можа быць аднастайнай: яна звязваецца з марфемным аналізам слова, падборам аднакаранёвых слоў падчас выканання **марфеміка-арфаграфічных практыкаванняў**, бо, як адзначае М. С. Раждзественскі, толькі пры "гнуткасці і разнастайнасці спосабаў праверкі можна весці размову пра ўтварэнне ў школьнікаў адпаведнага ўмення і навыку" [5, с. 33].

Пры выкананні марфеміка-арфаграфічных практыкаванняў і ажыццяўляюцца дзеянні на аснове алгарытмаў. Дзяцей трэба вучыць разважаць, дзейнічаць па алгарытме.

Сістэма марфеміка-арфаграфічных практыкаванняў па тэме "Правапіс слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці" для III класа можа быць наступнай.

1. Прачытайце. Якія літары трэба ўставіць у словы? Падбярыце такія аднакаранёвыя словы, каб яны з'яўляліся праверачнымі да прапанаваных слоў.

Біле(д/т), бяро(з/с)ка, лы(ж/ш)ка, сно(б/п), дзя(дз/ц)ька, дож(дж/ч), мы(ж/ш)ка, лу(г/х).

Запішыце словы разам з праверачнымі. Абазначце ў словах корань.

2. Прачытайце словы. Якія літары неабходна ўставіць замест пропускаў? Назавіце праверачныя словы. Што вы рабілі: змянялі прапанаваныя словы або падбіралі аднакаранёвыя словы?

Буке.., яга..ка, мядзве..ь, лё..кі, гара.., кала..кі, арэ.., тру..ка.

Запішыце словы разам з праверачнымі. Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба правяраць.

3. Прачытайце тэкст. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Мы гатавалі абед усёй сям'ёй. Бабуля варыла . Маці запякала  з мясам. Тата пёк . Я рабіла салату з цыбулі і . Брат Мішка наразаў .

Спішыце. Падкрэсліце ў словах літары, напісанне якіх трэба правяраць. Назавіце аднакаранёвыя словы, якія з'яўляюцца праверачнымі да слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі. Абазначце ў словах корань.

4. Паслухайце тэкст. Запішыце яго пад дыктоўку.

**Агарод**

Юля і Мішка ездзяць у вёску. Яны даглядаюць агарод. У Юлі ёсць свая градка. Там растуць боб і гарох. Мішка пасадзіў салодкую рэпку і радыску.

Падкрэсліце ў словах літары, напісанне якіх трэба правяраць. Назавіце праверачныя словы. Абазначце ў словах корань.

5. Прачытайце. Дапішыце словы, процілеглыя па значэнні прапанаваным словам.

загадка — ___________
цяжкі — ____________
усход — ____________
шырокі — ____________

Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба правяраць. Назавіце праверачныя словы.

У сучасным падручніку па беларускай мове для III класа ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання на вывучэнне тэмы "Роднасныя словы. Корань слова" разлічаны два ўрокі, і толькі ў адным з прапанаваных практыкаванняў прадугледжана заданне на замацаванне правапісу слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці [2]. Прычым у практыкаванні прапануюцца словы, у якія неабходна ўставіць прапушчаныя літары і растлумачыць іх правапіс. Пропускі ў словах выступаюць сігналам для прымянення правіла, што мабілізуе вучня да ўсвядомленага выкарыстання новага правіла. Калі навык сфарміраваны дастаткова трывала, затрымліваецца на спісванні са ўстаўкай прапушчаных літар немэтазгодна. Неабходна пераходзіць да больш складаных відаў практыкаванняў (спісванне са зmяненнем слоў, выбарачнае спісванне, групоўка слоў па арфаграфічных прыметах і г. д.). На новай ступені авалодання навыкам значную ролю адыгрывае такі від арфаграфічнага практыкавання, як дыктант. У працэсе запісу пад дыктоўку вучню неабходна самастойна вызначыць арфаграму, выбраць неабходны спосаб праверкі і выкарыстаць яго. У час запісу пад дыктоўку "толькі што засвоенае арфаграфічнае дзеянне адкладваецца на другі план, пры гэтым аўтаматызуецца і пераўтвараецца ў паўнацэнны навык" [3, с. 105].

У сувязі з гэтым могуць быць прапанаваны розныя віды дыктанта: папераджальны, тлумачальны, самадыктант (пісьмо па памяці) і інш.

У сістэме практыкаванняў павінна прасочвацца паступовае ўскладненне заданняў, якое ў значнай меры забяспечваецца характарам дыдактычнага матэрыялу. Работу па ўдасканаленні правапісу кожнай канкрэтнай арфаграмы трэба працягваць у працэсе вывучэння іншых тэм, з паступовым ускладненнем і ростам творчай самастойнасці вучняў.

Такім чынам, важнымі метадамі рэалізацыі прынцыпу апоры на марфемную структуру слова з'яўляюцца пашыраная мадэль алгарытмізацыі, сістэма марфеміка-арфаграфічных практыкаванняў, правядзенню якіх, як правіла, папярэднічае сістэма фанетыка-арфаграфічных практыкаванняў.

Выкарыстанне алгарытмізацыі садзейнічае асэнсаванню вучнямі арфаграфічных дзеянняў, стварае ўмовы для свядомага засваення правіл. Алгарытмізацыя знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі з выкананнем арфаграфічных практыкаванняў. Спецыяльная сістэма арфаграфічных практыкаванняў павінна быць разлічана на пяць узроўняў засваення арфаграфічнага матэрыялу. Пры адборы неабходнага комплексу практыкаванняў для работы па арфаграфіі трэба ўлічваць асаблівасці кожнай арфаграмы, этап яе вывучэння і ўзровень падрыхтаванасці вучняў.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Антановіч, Н. М. Арфаграфічная пісьменнасць вучняў пачатковых класаў устаноў адукацыі з рускай мовай навучання / Н. М. Антановіч, М. Г. Яленскі // Пачатковая школа. — 2012. — № 12. — С. 42—47.
2. Беларуская мова: падручнік для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / Т. М Валынец [і інш.]. — 2-е выд., выпраўл. і дап. — Мінск : НІА, 2012. — 136 с.
3. Власенков, А. И. Обучение русской орфографии, 5—11 классы: для школ с белорусским языком обучения. / А. И. Власенков. — 2-е изд., перераб. и доп. — Минск : Народная асвета, 1992. — 222 с.
4. Власенков, А. И. Формирование орфографических навыков в использовании алгоритмов обучения: автореф. ... дис. на соиск. уч. ст. канд. пед. наук / А. И. Власенков; Академия педагогических наук РСФСР, Научно-иследовательский институт общего и политехнического образования. — М., 1965. — 19 с.
5. Рождественский, Н. С. Развитие орфографических навыков у учащихся II класса / Н. С. Рождественский. — М. : Издательство Академии педагогических наук РСФСР, 1961. — 112 с.
6. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 2-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : НІА, 2010. — 120 с.
7. Учебные программы для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения: I—IV классы. Беларуская мова. — Минск : НИО, 2012. — С. 85—99.